к развитию личности подростка девиантного поведения, в том числе благодаря использованию механизмов индивидуальной педагогической работы и перспективных коллективных образовательных технологий. Аналогичные механизмы подготовки предусмотрены и в содержании ФГОС, определяющем подготовку магистров педагогического направления подготовки. Более того, мы не можем не обратить внимание, что преемственность в целом ряде вопросов, особенно в контексте индивидуализации образовательного процесса, реализуется в условиях регулирования трехуровневой системой подготовки выпускников.

Учитывая все сказанное выше, мы не можем не отметить необходимость использования позитивного, на наш взгляд, опыта работы в рамках подготовки к обеспечению развития личности девиантного подростка, описанного выше, и реализованного в рамках работы высшего учебного заведения. Фактически, активное заимствование данного опыта высшими учебными заведениями, занимающимися подготовкой выпускников-педагогов, позволит и минимизировать риски, связанные с развитием крайних форм девиантного, в том числе антисоциального поведения среди подростков, и, с другой стороны, даст возможность избежать проблем, связанных с деформацией развития личности девиантных подростков.


Список цитированных источников:

1. Рыжова, О.С. Компетентностный подход к подготовке специалистов в области профилактики девиантного поведения несовершеннолетних / О.С. Рыжова // Евразийский союз ученых. – 2015. – № 7–4. – С. 117–120.
2. Бражников, Д.А. Криминальная ситуация в Российской Федерации: состояние и тенденции / Д.А. Бражников, О.Р. Афанасьев, В.И. Коваленко // Юридическая наука и правоохранительная практика. – 2017. – № 3(41). – С. 66–79.
3. Емельянова, Е.В. Перспективные направления развития межведомственного взаимодействия в сфере профилактики правонарушений (на примере МВД России и ФСИН России) / Е.В. Емельянова, Е.В. Червонных, С.А. Боровая // Труды Академии управления МВД России. – 2015. – № 3(35). – С. 34–38.
4. Грошева, Р.Н. Модель профессиональной компетентности педагога как воспитателя детей и подростков девиантного поведения / Р.Н. Грошева // Современные проблемы науки и образования. 2014.– № 2. – С. 253–259.
5. Гонеев, А.Д. Технологии профессионально-личностной подготовки будущего учителя к коррекционно-педагогической деятельности с девиантными подростками / А.Д. Гонеев // Инженерные технологии и системы. – 2009. – № 2. – С. 88–103.
6. Приказ от 22.02.2018 г. № 121 «Об утверждении Федерального государственного образовательного стандарта высшего образования – бакалавриат по направлению подготовки 44.03.01 Педагогические науки». [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://fgos.ru/fgos/fgos-44-03-01-pedagogicheskoe-obrazovanie-121/?ysclid=l7320ut0mn623736767. – Дата доступа: 18.08.2022.
7. Гурьев, М.Е. Психологический анализ возрастных особенностей подростков, имеющих девиантное поведение / М.Е. Гурьев // Новое слово в науке и практике: гипотезы и апробации результатов исследования. – 2015. – № 16. – С. 69–76.



**ЛІПЧЫК ДАР’Я ПАЎЛАЎНА**
Рэспубліка Беларусь, Мінск, БДПУ імя Максіма Танка


## ФАРМІРАВАННЕ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

Праблема фарміравання інфармацыйнай культуры ў сучасным грамадстве з’яўляецца вельмі актуальнай. У апошнія гады ўзрасла цікавасць да паняцця “інфармацыйная культура”. Яго распаўсюджванне выклікана ўплывам навукова-тэхнічнага прагрэсу на агульную культуру грамадства, асобы. Інфармацыйная культура чалавека стала часткай агульначалавечай культуры, неабходным звяном адукацыйнай дзейнасці як настаўнікаў, так і вучняў, якаснай характарыстыкай іх інфармацыйнай дзейнасці ў складзе адукацыйнай дзейнасці.

Праблемы, з якімі сустракаецца настаўнік у працэсе фарміравання інфармацыйнай культуры, перш за ўсё, звязаны з сутыкненнем, а часам і заменай высокакультурных каштоўнасцей дасягненнем сучасных тэхналогій, якое, як правіла, суправаджаецца зніжэннем агульнакультурнага і агульнаадукацыўнага ўзроўня дзяцей і падлеткаў. У сувязі з гэтым адным з актуальных

напрамкаў дзейнасці настаўніка і вучня становіцца пошук шляхоў фарміравання інфармацыйнай культуры вучняў пачатковых класаў, накіраваных не толькі на авалоданне інфармацыйнымі працэсамі, але і на засваенне маральных каштоўнасцей.

У цяперашні час працэс чытання ў многіх дзяцей не выклікае ўстойлівага інтарэсу, не займае значнага месца ў правядзенні вольнага часу. Гэта можа быць звязана з невысокай матывацыяй вучняў да чытання, таму важна, каб на ўроках літаратурнага чытання настаўнік заахвочваў вучняў да чытацкай дзейнасці і давай ім неабходную матывацыю. Вучні не разглядаюць кнігу як крыніцу асобаснага развіцця і атрымання інфармацыі, таму настаўніку важна выхоўваць у вучняў разуменне каштоўнасці кнігі як крыніцы развіцця асобы, самаўдасканальвання чалавека, задавальнення пазнавальных і эстэтычных патрэб чалавека.

Вялікая колькасць недакладнай інфармацыі, імклівае развіццё тэлебачання, інтэрнэту, новыя магчымасці, якія даюць сродкі медыя, прыводзяць да таго, што "экранная культура" ўсё мацней уплывае на чытанне дзяцей. Актыўнае, самастойнае чытанне губляе сваю папулярнасць, што негатыўна адбіваецца на развіцці ўвагі, мыслення дзяцей, іх здольнасці разумець прачытанае і разважаць над сутнасцю мастацкіх твораў.

Таму важна паказаць дзецям, што чытанне кнігі дазваляе чытачам на прыкладах паводзін герояў зразумець важныя жыццёвыя высновы, вучыць глыбокай, шматаспектнай працы з інфармацыяй. Кніга дапамагае фарміраваць рознабаковую асобу, аказвае ўплыў на ўнутраны свет чалавека з дапамогай пачуццяў, якія адчувае чалавек пры чытанні. Кніга вучыць новым ведам, гісторыі жыцця людзей з пакалення ў пакаленне. Навучанне і выхаванне – гэта галоўная яе роля. Кніга дазваляе спазнаць прыгажосць навакольнага свету, акунуцца ў гісторыю не толькі аднаго горада ці краіны, а ўсяго свету. Творы розных жанраў дапамагаюць у разуменні мінулага, фарміраванні сучаснасці і пабудове будучыні.

Тэрмін "інфармацыйная культура" ў навукова-метадычнай літаратуры ўпершыню з'явіўся ў 70-х гг. Ініцыятарамі прыцягнення ўвагі да гэтага феномену з'явіліся работнікі бібліятэк. Да гэтага часу праблема фарміравання інфармацыйнай культуры актыўна вывучаецц вучонымі розных галін навукі, аднак адзінага азначэння паняцця "інфармацыйная культура" на дадены момант не сфармулявана.

У межах дадзенага артыкулу разгледзім паняцце інфармацыйнай культуры з гуманітарнага боку. Н.І. Гендзіна лічыць, што інфармацыйная культура – "адна з частак агульнай культуры чалавека; сукупнасць інфармацыйнага светапогляду і сістэмы ведаў і ўменняў, якія забяспечваюць мэтанакіраваную самастойную дзейнасць па аптымальным задавальненні індывідуальных інфармацыйных патрэб з выкарыстаннем як традыцыйных, так і новых інфармацыйных тэхналогій" [1, с. 512]. Паводле меркавання А.А. Мядзведзевай, "інфармацыйная культура – гэта ўзровень ведаў, які дазваляе чалавеку свабодна арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы, удзельнічаць у яго фарміраванні і садзейнічаць інфармацыйнаму ўзаемадзеянню" [3, с. 59]. Па словах Н.Б. Зіноўевай, інфармацыйная культура – "гарманізацыя ўнутранага свету асобы пад час засваення ўсяго аб'ёму сацыяльна-значнай інфармацыі" [2, с. 141].

У структуры паняцця "інфармацыйная культура асобы" можна вылучыць тры кампаненты: эмацыянальна-каштоўнасны, кагнітыўны, паводзінскі. Эмацыянальна-каштоўнасны кампанент (установкі, ацэнкі, адносіны) уключае [2]:

– аналіз зместу інфармацыйных патрэб і інтарэсаў асобы;
– матывы звароту да розных крыніц інфармацыі і звязаныя з гэтым чаканні;
– пераважнасць крыніц атрымання неабходнай інфармацыі ў залежнасці ад канкрэтнай тэмы і сітуацыі;
– усведамленне неабходнасці ацэнкі зместу інфармацыйных паведамленняў з маральнага пункту гледжання.

Вельмі важна, каб на ўроках літаратурнага чытання настаўнік надаваў асаблівую ўвагу фарміраванню эмацыянальна-каштоўнаснага кампанента ў структуры інфармацыйнай культуры асобы. Педагог павінен скіроўваць дзяцей на аналіз уласнага эмацыянальнага стану ў час ўспрымання твора, вызначэнне вобразных сродкаў твора і іх ролі ў асэнсаванні галоўнай думкі твора. Для таго, каб вучні ўспрынялі і зразумелі твор якасна і паўнаватасна, важна дасканала прадумваць усе этапы працы, метады і прыёмы працы над мастацкім тэкстам. Пры гэтым, згодна з патрабаваннямі вучэбнай праграмы, адбываецца ўзбагачэнне эмацыянальнага вопыту на падставе прачытанага твора (знаходжанне ў творы знешніх праяў чалавечых эмоцый і пачуццяў,

адпаведных ім апісанняў малюнкаў прыроды), стымуляванне эмпатыўных пачуццяў у вучняў (спачуванне, суперажыванне і іншыя), перажыванне і выказванне іх з дапамогай настаўніка.

Змест кагнітыўнага кампаненту (веды, уменні, навыкі абыходжання з інфармацыяй) ўключае [2]:

– засваенне норм і правіл інфармацыйнай бяспекі пры рабоце з інфармацыяй;

– авалоданне даступнымі ўзросту ведамі аб інфармацыйных працэсах, відах і ўласцівасцях інфармацыі, асноўных крыніцах інфармацыі, алгарытмах пошуку неабходнай інфармацыі;

– замацаванне атрыманых тэарэтычных звестак і назапашванне практычнага вопыту работы з інфармацыяй: фарміраванне ўменняў пошуку, адбору, структуравання, сістэматызацыі, абагульнення, пераўтварэння і прадстаўлення інфармацыі ў іншым выглядзе, зразумелым іншым людзям;

– уменне размаўляць з іншымі людзьмі з дапамогай інфармацыі, запазычанай з розных крыніц.

Кагнітыўны кампанент фарміруецца на кожным уроку і ў пазавучэбнай дзейнасці. На ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе вучні знаёмяцца з мастацкімі творамі розных жанраў: казка, апавяданне, верш, байка. Акрамя гэтага, вядзецца праца з творамі малых жанраў: загадка, скарагаворка, прыказка, прымаўка. Дзякуючы знаёмству з дадзенымі жанрамі вучні атрымоўваюць першапачатковыя веды ў галіне літаратурнай адукацыі. Напрыклад, пры вывучэнні казак дзеці даведваюцца, что казкі бываюць розных відаў: пра жывёл, бытавыя, чарадзейныя, асэнсоўваюць іх асаблівасці. Пры фарміраванні кагнітыўнага кампанента пашыраецца кругагляд вучняў шляхам знаёмства з даступнымі ўзросту біяграфічнымі звесткамі пра жыццё і творчасць пісьменнікаў, а таксама пра розныя сферы навакольнай рэчаіснасці.

Паводзінскі кампанент (рэальныя і патэнцыяльныя паводзіны) уключае [2]:

– зварот да розных крыніц інфармацыі ў залежнасці ад тэмы і канкрэтнай мэты пошуку;
– авалоданне сістэмай пошуку і адбору неабходнай інфармацыі;
– прагназаванне характару атрыманай інфармацыі;
– прымяненне атрыманай інфармацыі ў розных сферах сваёй дзейнасці;
– засваенне правілаў інфармацыйнай бяспекі асобы.

Паводзінскі кампанент мэтазгодна фарміраваць на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе на ўроках класнага і пазакласнага чытання. Мастацкія творы, якія дэманструюць розныя мадэлі паводзін герояў, даюць падставу для фарміравання рэальных і патэнцыяльных паводзін вучняў у паўсядзённым жыцці. Калі вучань фармуліруе галоўную думку твора, выказвае свае адносіны да герояў, вызначае прычынна-выніковыя сувязі, безумоўна, ён назапашвае вопыт сацыяльных зносін. Мастацкія творы даюць шырокую прастору і для развіцця творчых здольнасцей вучняў: чытанне па ролях, складанне працягу твора, невялікіх крыжаванак, віктарын, стварэнне малюнкаў і інш.

Урок літаратурнага чытання валодае значным патэнцыялам для ўдасканалення інфармацыйнай культуры асобы шляхам авалодання рознымі відамі чытання і аналізу твораў. Узгадаем, што чытанне – гэта базавы кампанент выхавання, адукацыі і развіцця культуры. Яно з’яўляецца дзейнасцю, якая фарміруе і развівае асобу, інструментам атрымання адукацыі і распаўсюджвання культуры, сведчаннем сфарміраванасці камунікатыўнай і прафесійнай кампетэнцыі спецыяліста, інструментам дасягнення поспеху чалавека ў жыцці. Роля чытання ў развіцці ў дзіцяці ўяўлення, засваенні мовы класічнай літаратуры, развіцці маўлення, пабудове сваёй індывідуальнай мадэлі культуры вельмі вялікая [4; 5].

Згодна з вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)” вучань павінен выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці: ацэньваць уласныя паводзіны і жыццёвыя сітуацыі з пазіцый маральных норм і культурных каштоўнасцей. Таксама вучню неабходна асэнсавана выбіраць і чытаць творы, якія адпавядаюць яго ўзросту, абменьвацца думкамі па прачытаным ці праслуханым творы; асэнсавана ўспрымаць вусную і пісьмовую інфармацыю для задавальнення пазнавальных інтарэсаў; узбагачаць эмацыянальна-каштоўнасны вопыт праз успрыманне твораў розных відаў мастацтва [1]. У працэсе чытання і асэнсавання твораў у залежнасці ад этапаў працы над творам выкарыстоўваюцца рэпрадуктыўныя, часткова-пошукавыя, даследчыя метады: гутарка,

эўрыстычная гутарка, дыскусія, дыдактычная гульня, прагназаванне, складанне структурна-лагічных схем, мадэляванне, драматызацыя, іншыя метады [1].

На нашу думку, усе кампаненты інфармацыйнай культуры фарміруюцца ў комплексе. Спалучэнне на ўроку літаратурнага чытання розных форм інфармацыйнай дзейнасці, узбагачэнне эмацыянальна-каштоўнаснай сферы, развіццё творчых здольнасцей вучняў дазволіць дасягнуць дастатковага ўзроўню інфармацыйнай культуры як важнай часткі агульнай культуры асобы.

Такім чынам, з гуманітарнага пункта гледжання важна сістэмна фарміраваць інфармацыйную культуру вучняў пачатковых класаў у адукацыйным працэсе, у тым ліку – на ўроках літаратурнага чытання. Існуе праблема ўзмацнення матывацыі вучняў да чытання, і настаўнік выконвае вельмі важную ролю ў пераадоленні гэтай праблемы. Дзякуючы педагагічнаму кіраўніцтву ў вучняў павінна з'явіцца жаданне чытаць і аналізаваць творы розных жанраў, выкарыстоўваць веды і ўменні, якія яны набываюць у час чытання, у сваім жыцці. Таму фарміраванне інфармацыйнай культуры вучняў пачатковых класаў на ўроках літаратурнага чытання, на наш погляд, можна лічыць скразной мэтай пачатковай літаратурнай адукацыі і важнай задачай выхавання асобы.

Спіс цытаваных крыніц:

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» (літаратурнае чытанне). II клас // Национальный образовательный портал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2022-2023/3799-ii-klass.html. – Дата доступа: 31.08.2022.

2. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Інфармацыйны навігатар» (літаратурнае чытанне). III клас // Национальный образовательный портал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2022-2023-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2022-2023/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2022-2023/3799-ii-klass.html. – Дата доступа: 31.08.2022.

3. Формирование информационной культуры личности: теоретическое обоснование и моделирование содержания учебной дисциплины / Н.И. Гендина [и др.]. – М.: Межрегион. центр библиотечного сотрудничества, 2006. – 512 с.

4. Зиновьева, Н.Б. Информационная культура личности: Введение в курс: учеб. пособие для вузов культуры и искусства / под ред. И.И. Горловой; Краснодар. гос. акад. культуры. – Краснодар, 1996. – 141 с.

5. Медведева, Е.А. Основы информационной культуры // Социологические исследования. – 1994. – № 11. – С. 59.

6. Стефановская, Н.А. Социологические исследования чтения: теория, методика, практика / Н.А. Стефановская. – М.: Литера, 2013. – 143 с.

7. Чудинова, В.П. Дети и библиотеки в меняющейся медиасреде / В.П. Чудинова, О.Л. Кабачек. – М.: Шк. б-ка, 2004. – 336 с.

**МИХАЙЛОВСКАЯ ЕЛЕНА ИГОРЕВНА**
Республика Беларусь, Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова

## ВОЗМОЖНОСТИ ИНТЕРПРЕТАЦИИ ЛИТЕРАТУРНОГО ТВОРЧЕСТВА М.М. БОБОРИКО В ФОРМАТЕ КУКОЛЬНЫХ СПЕКТАКЛЕЙ

В 2022 г. педагогический факультет ВГУ имени П.М. Машерова отмечает свой юбилей – 65 лет. За это время факультет подготовил более 40 тысяч высококвалифицированных специалистов: воспитателей учреждений дошкольного образования, учителей начальных классов, музыки, ритмики и хореографии, учителей-дефектологов.

У факультета богатая история: в разные периоды времени он реорганизовывался, менялись названия, специальности, руководители и педагогический состав. Сегодня учебный процесс на педагогическом факультете осуществляют 3 кафедры: кафедра дошкольного и начального образования (зав. кафедрой – Н.В. Щепеткова, кандидат педагогических наук), кафедра коррекционной работы (зав. кафедрой – Н.И. Бумаженко, кандидат педагогических наук, доцент) и кафедра музыки (зав. кафедрой – С.А. Карташев, кандидат педагогических наук, доцент). Студенты обучаются по следующим специальностям (дневная и заочная форма обучения): «Начальное образование», «Дошкольное образование», «Олигофренопедагогика», «Музыкальное искусство, ритмика и хореография».